# ІРАН ЦІКАВІЦЬ УСІХ!..

**На адкрыццё выстаўкі «Іран — каштоўная зямля», якая днямі адкрылася ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры», нягледзячы на пандэмію, прыйшло нямала гасцей. Літаральна не было дзе яблыку ўпасці.**

Гэта найбольш радавала арганізатараў. І найперш — пасольства Ірана ў Рэспубліцы Беларусь, што і падкрэсліў у сваім выступленні на ўрачыстым адкрыцці выстаўкі спадар пасол Саід ЯРЫ. З асаблівым піетэтам і павагай ён прадставіў ганаровых гасцей. Пазнаёміца з традыцыйнай іранскай культурай, прадметамі, якія можна сапраўды лічыць з'явамі ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, у каліграфіі і жывапісе ўсходняй краіны з багатай гісторыяй, прыйшлі дыпламаты, дэпутаты, вучоныя, грамадскія дзеячы, мастакі і мастацтвазнаўцы... Сярод гасцей — дэкан факультэта філасофіі і сацыяльных навук Белдзяржуніверсітэта кандыдат гістарычных навук Вадзім Гігін, дэкан факультэта міжнародных адносін БДУ доктар гістарычных навук Віктар Шадурскі, старшыня Мусульманскага рэлігійнага аб'яднання ў Беларусі Абу-Бекір Шабановіч, старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Андрэй Савіных, намеснік старшыні гэтай камісіі Алег Гайдукевіч, мастак Каміль Камал, мастацтвазнавец Наталля Шаранговіч і шмат хто яшчэ.

Выстаўкі падобнага характару спрыяюць усталяванню добразычлівых узаемаадносін паміж краінамі, шмат каго падштурхоўваюць да праяўлення зацікаўленасці Усходам, непасрэдна Іранам, іранскай культурай. Пра гэта гаварылі на адкрыцці і спадар Саід Яры, і беларускія парламентарыі, вучоныя, дзеячы культуры.

**Сяргей ШЫЧКО.**



Фота Кастуся ДРОБАВА.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ